http://edoc.bseu.by

***В. М. Матусевіч***
*Навуковы кіраўнік — кандыдат гістарычных навук В. М. Лянцэвіч*
*БДЭУ (Мінск)*

# ЛЮБЛІНСКАЯ ЎНІЯ Ў АЙЧЫННАЙ І ЗАМЕЖНАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Люблінская ўнія — дзяржаўная дамова паміж Каронай Польскай (КП) і Вялікім Княствам Літоўскім (ВКЛ), якая паклала пачатак канфедэратыўнай дзяржаве, вядомай як Рэч Паспалітая. Актуальнасць тэмы бачыцца ў дамінаванні ў беларускай гістарыяграфіі адмоўных ацэнак Люблінскай уніі і звязанага з гэтым негатыўнага вобразу Рэчы Паспалітай у свядомасці беларусаў розных часоў. Гісторыкі разглядаюць падпісанне ўніі з розных бакоў: некаторыя ацэньваюць яе як маніпуляцыю з боку Кароны, іншыя выкарыстоўваюць другі падыход да праблемы.

Згодна з умовамі падпісанага ў 1569 г. акту можна зрабіць выснову, што ўнія з'яўляецца інкарпарацыяй ВКЛ у склад КП.

Аналіз поглядаў гісторыкаў наконт перыяду перад і пасля падпісання ўніі на тэрыторыях ВКЛ і КП пачнем з меркаванняў беларускіх аўтараў пачатку XX ст. — часоў т. зв. нашаніўскага Адраджэння. Для вядомага гісторыка і палітычнага дзеяча У. М. Ігнатоўскага ўнія была рэалізацыяй імперыялістычных намераў Польшчы, якая выкарыстала цяжкае становішча ВКЛ і навязала яму несправядлівае аб'яднанне, што адкрыла браму для польскага ўплыву на Літву і Беларусь [1, с. 114–115]. Гісторык В. Ластоўскі бачыў у гэтым падпісаным акце навязаную палякамі капітуляцыю, калі «Літоўска-Беларуская дзяржава была прымушана здацца», словам, канец незалежнасці, а ўтвораную Рэч Паспалітую атаясамліваў з Каронай [2, с. 46].

Зыходзячы з прафесійных поглядаў сучаснага расійскага гісторыка М. С. Удовіна, можна заўважыць, што ўнію аўтар называе «залатым векам польскай шляхты». Шляхта ў большай ступені была зацікаўлена ў вырашэнні местачковых праблем, якія ў першую чаргу дазвалялі павялічыць асабісты даход, і ў значна меншай ступені — у вырашэнні агульнадзяржаўных пытанняў, перш за ўсе абароназдольнасці. З прычыны шматлікіх балючых падзей для краіны некалі адна з наймацнейшых дзяржаў Еўропы стала аб'ектам дзяльбы тэрыторыі для больш моцных суседзяў [3, с. 111–112].

З сучасных беларускіх гісторыкаў возьмем меркаванні І. Саверчанкі і А. Дземідовіча. Першы лічыць, што дамова паміж ВКЛ і КП была часовым вайскова-палітычным хаўрусам з мэтай захавання ВКЛ, бо без заключэння ўніі беларускае гаспадарства магло амаль зусім знікнуць з карты свету з прычыны Лівонскай вайны [4, с. 11]. А. В. Дземідовіч, у сваю чаргу, паслялюблінскі перыяд называў «сапегаўскім», прагрэсіўным. Менавіта палітыка Льва Сапегі як дзяржаўнага лідэра стала гарантам захавання ВКЛ. Статут 1588 г., выдадзены па ініцыятыве і пры падтрымцы канцлера, стаў адным з фактараў «вялікакняскага адраджэння» — пачатку новага, прагрэсіўнага перыяду для ВКЛ [5, с. 226].

У выніку можна ўбачыць, што кожны згаданы аўтар мае сваю асабістую думку наконт Люблінскай уніі. Знойдуцца тыя, хто будзе разглядаць падпісаны акт як маніпуляцыю Польшчы, а хтосьці ўбачыць у дамове новую старонку ў гісторыі ВКЛ. Важна адзначыць, што, нягледзячы на ўсе негатыўнае ў змесце і наступствах уніі, гэта ўсе ж пэўны этап, які з'яўляецца ўнікальным вопытам, які мае месца быць у некалі новастворанай Рэчы Паспалітай, якая стала адной з самых буйных і магутных краін тагачаснай Еўропы.

**Крыніцы**


1. *Ігнатоўскі, У. М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. М. Ігнатоўскі. — 5-е выд. — Мінск : Беларусь, 1992. — 190 с.
2. *Ластоўскі, В. Ю.* Кароткая гісторыя Беларусі / В. Ю. Ластоўскі. — Мінск : Універсітэцкае, 1993. — 126 с.
3. *Вдовин, М. С.* Особенности выбора институционального пути развития в Восточной Европе XVI–XVII веков: Московское государство и Речь Посполитая / М. С. Вдовин // Балт. регион. — 2011. — № 4. — С. 111–122.
4. *Саверчанка, І. В.* Люблінская вайскова-палітычная унія 1569 года паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польшчай / І. В. Саверчанка // Гісторыя: праблемы выкладання. — 2008. — № 2. — С. 6–12.
5. *Дземідовіч, А. В.* Люблінская унія 1569 г. ва ўспрыманні шляхты беларускіх зямель (другая палова XVI — першая трэць XVII стст.) / А. В. Дземідовіч // Леў Сапега (1557–1633 гг.) і яго час : зб. навук. арт. / Гродз. дзярж. ун-т ; рэдкал.: С В. Марозава [і інш.]. — Гродна, 2007. — С. 224–228.